Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Наша Праўда

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрес Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адраса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 30 Вільня, Субота 16-га ліпня 1927 г. Год I

Спыненьне сэсіі парляманту.

Сойм, склікаы на надзвычайную сэсію дэкрэтам Прэзыдэнта, толькі-толькі пасьпеў распачаць сваю працу, а вось новы дэкрэт таго-ж Прэзыдэнта 13 ліпня яе прыпыніў, ня даўшы ані разглядзець на пленуме Сойму выданыя Прэзыдэнтам бяз Сойму законы, ані закончыць апрацоўку цэлага раду законапраектаў, над якімі ўжо ад даўжэйшага часу йшла дыскусія ў Сойме.

Адначасна з Соймам спыняе сваю працу й Сэнат.

Нельга сказаць, каб гэты крок ураду быў неспадзяваны. На колькі дзён перад спыненьнем сэсіі абедзьвюх заканадаўчых палат „бутэрбродныя" газэты адзначалі, што адносіны між Соймам і ўрадам усё завастраюцца, і ў пэўны мамэнт можа ўрад... страціць цярплівасьць! Адзначалі газэты такжа й тое, што быццам ужо 11 ліпня адбылося паседжаньне Рады Міністраў, дзе абгаварывалася справа тактыкі ўраду адносна да Сойму, які ўсё больш вызваляецца з-пад „кіраўніцтва" ды волі ўраду; тады-ж, відаць, была прынята пастанова аб спыненьні соймавае сэсіі.

Што-ж трэба лічыць беспасярэдняй прычынай гэтага кроку ўраду?

Справа ў тым, што Сойм рашуча ставіў на чаргу дня праекты самаўрадавых законаў, проці якіх таксама рашуча выступаў урад. Справа і ў тым яшчэ, што ў найбліжэйшыя дні меў вырашыцца канчаткова і лёс урадавых дэкрэтаў, якія ўжо былі ўнесены ў Сойм, а некаторыя дык ужо ня толькі разгледжаны, але і скасаваны камісіяй Сойму, дый яшчэ аднагалосна, як прыкладам прэсавы дэкрэт... І гэта ўжо—другі раз! У найбліжэйшыя-ж дні Сойм меўся скасаваць і распараджэньне міністра-пілсудчыка п. Медзінскага аб тэлефоных лічніках, прыняць закон аб пазбаўленьні афіцэраў і жаўнераў выбарных правоў у публічныя ўстановы (што, праўду кажучы, прадбачана ў Канстытуцыі!), а гэта было-б асабліва недаспадобы некаторым сябрам ураду... Дык ужо напярэдадні спыненьня сэсіі паслы дапускалі магчымасьць, што ўрад, каб не дапусьціць да ўсіх гэтых „проціўрадавых" выступленьняў Сойму, папросту, спыніць самае ягонае жыцьцё.

Апошнія прадбачаньні, аднак, не апраўдаліся: ўрад так далёка не пайшоў. Справа ў тым, што гэты стары Сойм яшчэ пакуль-што для ўраду патрэбен, і распускаць яго цяпер-жа зусім, ды ждаць, што прынясуць новыя выбары,—і нявыгадна, і рызыкоўна! Бо-ж ёсьць цэлы рад спраў, дзеля якіх патрэбна згода Сойму, а ў гэтай згодзе *сучаснага* Сойму ўрад наперад перакананы.

Перадусім, замежныя банкіры, адкрываючы навет толькі 15-мільённы „рахунак" польскаму ўраду ў сваіх банках, быццам паставілі варунак, каб гэты крэдыт быў зацьверджаны Соймам... З другога боку, ураду патрэбна выражэньне даверыя Сойму да ўрадавае замежнае палітыкі, і ў гэтай справе меўся выступіць перад Соймам з нейкімі важнымі заявамі дый агульным экспозэ міністар Залескі... Але ён захварэў, дый усё ня мог назначыць для гэтага паседжаньня камісіі замежных справаў, а ўрад дапусьціць да нямілых яму пастановаў Сойму ў справе прэсавага і іншых дэкрэтаў не хацеў. Дык і прыйшлося не распусьціць Сойм зусім, а толькі спыніць ягоную працу да часу, — а ў найбліжэйшыя месяцы, калі будзе трэба ўраду, яго ізноў склічуць на новую „надзвычайную" сэсію, каб ізноў распусьціць, як будзе ўжо непатрэбны...

Так з кожным днём павага польскага Парляманту меншае і меншае... Каму гэта выгадна,—хіба тлумачыць ня трэба!

Першае паседжаньне віленскае мястовае рады.

У чацьвер, 14 га ліпня, адбылося першае паседжаньне новаабранае мястовае рады Вільні.

На парадку дня стаялі перадусім выбары прэзыдэнта места і ягонага заступніка (віцэ-прэзыдэнта).

З прычыны таго, што эндэкам не ўдалося ўтварыць блёк усіх польскіх груп радных, эндэцкая фракцыя заявіла, што яна ані свайго кандыдата не выстаўляе, ані ня будзе падтрымліваць ніводнага з другіх кандыдатаў, а будзе падаваць на выбарах белыя картачкі.

Пры выстаўленьні кандыдатур запіскамі аказаліся высунутымі чатыры кандыдаты: беларус Кузьма Крук (5 галасоў), пэпээсавец Вітольд Чыж (9 галасоў), былы расейскі кадэт цяпер польскі паступовец („сэнатар"), ведамы адвакат Аляксандар Ледніцкі (4 галасы) і Вінцэнты Лучыньскі, кандыдат манархістаў з „дванасткі" (5 галасоў).

Пры першым галасаваньні атрымалі галасоў: Ледніцкі—15, Чыж—12, Крук—5, Лучыньскі — 5. 11 картачак пададзена пустых. Згодна з выбарнай інструкцыяй, кандыдатуры Крука і Лучыньскага адпалі, і пры другім галасаваньні падаваліся галасы ўжо толькі за двух кандыдатаў: Ледніцкага і Чыжа. Перамога аказалася на старане Ледніцкага: ён атрымаў 20 галасоў, Чыж—толькі 16. Гэтак **выбраны за прэзыдэнта Ледніцкі.**

Кандыдатура **беларускага раднага** Крука была падтрымана выключна **аб'яднанай работніцкай лявіцай**. Прадстаўнік **расейцаў** (ён-жа ярэмічаўскі „старшыня" фальшаванага „Бел. Нац К-ту) **сэнатар Багдановіч**, хаця на выбарах у мястовую раду йшоў пад „русско-бѣлорусскимъ" сьцягам, аддаў пры выбары прэзыдэнта свой голас **не за беларуса**, а за **польскага кандыдата**. Гэтак сэн. Багдановіч зразу-ж паказаў, з кім ён будзе ісьці ў мястовай радзе!

Адзіны прадстаўнік літвіноў гэтак сама **не падтрымаў беларускага кандыдата і галасаваў за паляка.**

Кандыдатура раднага Крука, ведама-ж, не магла мець ніякае надзеі на выбар у прэзыдэнты места, а была **выстаўлена дэманстрацыйна:** аб'яднаны работніцкі блёк, хацеў гэтым выявіць свае недаверые да буржуазіі, яе кандыдатам, ды адначасна, галасуючы за беларуса, сцьвярдзіў гэтым **сваё прызнаньне роўных правоў беларускага насяленьня сталіцы Заходняе Беларусі з правамі пануючае тут польшчыны.** І ў гэтым—вялікае значэньне як самага выстаўленьня беларускае кандыдатуры на прэзыдэнта места, так і атрыманьне ею галасоў польскіх работнікаў — „Незалежных Сацыялістаў" і „Лявіцы ППС".

Мы з прыемнасьцяй адзначаем гэты першы крок беларусаў у першай мястовай радзе Вільні, у якой мы здабылі прадстаўніцтва для сябе. Мы адзначаем такжа яркі доказ **клясавае салідарнасьці польскіх работніцкіх выбранцаў з працоўнымі беларусамі.**

За віцэ-прэзыдэнта выбраны пэпэсавец Чыж.

Сойм і Сэнат.

Самаўрадавыя законы ў Сойме.

Сойм прыняў на паседжаньні 12 ліпня ў другім чытаньні законапраект аб вясковай гміне.

Проці вайны.

На паседжаньні Сойму 20-га чэрвеня Камуністычная Фракцыя Сойму выступіла з дамаганьнем, каб Польшча чым хутчэй зрабіла з СССР умову аб узаемным ненападаньні. Адначасна Фракцыя дамагалася безадкладнае ліквідацыі на тэрыторыі Польшчы ўсіх расейскіх контр-рэвалюцыйных арганізацыяў і высяленьня іх сяброў па-за межы гаспадарства.

Дамаганьне гэтае было падтрымана пасламі з НПХ. Калі-ж паслы-камуністы зьвярнуліся да беларускага пасла Ярэміча і ўкраінскага Паўлы Васыньчука, каб далучылі і свае подпісы да камуністычнае прапазыцыі,—тыя абодва рашуча адмовіліся падпісаць.

У сувязі з гэтым у прэсавым камунікаце Камуністычнае Фракцыі чытаем:

„Паны гэныя (Ярэміч і Васыньчук), ідэалам якіх зьяўляецца „фэдэрацыя" з.... Польшчай, ды заваяваньне Пілсудскім вольных работніцка-сялянскіх рэспублік — УСРР і БСРР,—тлумачылі сваю адмову тым, што не прызнаюць рыжскага трактату і дзеля гэтага выступаюць проці ўмовы аб узаемным ненападаньні з СССР. — Трудна знайсьці больш яўнае і цынічнае прызнаньне да сваей нягоднай ролі—агентаў фашызму і імпэрыялізму!"—заяўляе ў канцы камунікат...

Ну, мы бачылі й лепшыя рэчы з боку пана Ярэміча, і нас дзівіць наіўнасьць тых камуністычных паслоў, якія лічылі магчымым зварачацца да гэнага пана ў падобнай справе.

Апошнія паседжаньні й канец сэсіі.

Як мы прадбачылі, рэзултатам усё завастраўшагася канфлікту між Соймам і ўрадам зьявілася спыненьне, калі яшчэ ня жыцьця, дык — усей працы Сойму: сэсія яго раптам зачынена дэкрэтам п. Прэзыдэнта...

13-га ліпня ў соймавых камісіях ішла праца нармальна. Ніхто ня ведаў аб падыходзе хмары. Канстытуцыйная камісія працавала над аканчальнай рэдакцыяй законапраекту ППС аб парадку публікаваньня дэкрэтаў п. Прэзыдэнта, а таксама і пастановаў Сойму, аб скасаваньні гэтых дэкрэтаў. Прапазыцыя пэпэсаў, якая яўна выражала недаверые да ўраду, як наагул і ўся дыскусія ў гэтай справе, мелі вельмі вострыя характар: не знайшлося ніводнага аратара ў камісіі, які-б у тэй ці іншай форме выразіў даверые да ўраду.

Каля 1 гадзіны сабраўся на пленум Сойм. На парадку дня асьцярожны старшыня п. Ратай паставіў толькі адну справу: 3—яе чытаньне праекту закона аб мястовым і павятовым самаўрадах. Але павадыр эндэцыі патрэбававаў дапаўненьня павесткі ўнясеньнем у яе дыскусіі над 2 прэсавымі дэкрэтамі, якія ўжо прайшлі праз камісію, і — якраз аб гэтым вострым законапраекце ППС —аб парадку публікаваньня пастановаў Сойму датычна касаваньня дэкрэтаў п. Прэзыдэнта...

Прапазыцыю эндэцкага пасла падтрымаў амаль не аднагалосна ўвесь Сойм; проці яе галасавалі толькі 4 паслы з урадавага Клюбу Працы і некалькі пястоўцаў...

Пасьля палудня працавала яшчэ асьветная камісія, якая большасьцю правых галасоў прыняла прапазыцыю эндэцкага пасла аб „ахове польскасьці й каталіцкасьці школы" ў Польшчы...

У 4 гадзіны пачалося паседжаньне Сэнату, які галоўным чынам займаўся праектам зьмены Канстытуцыі. Цэлы рад дакладчыкаў рэфэравалі розныя праекты, якія прайшлі праз камісіі, — паміж іншым і справу дапамогі запасным, пакліканым на летнія вучэньні. Усё справы вельмі пільныя, бо прайшлі ўжо праз Сойм, ды мусяць зараз-жа стацца законам...

Агульную ўвагу зварачаў на сябе седзючы на ўрадавых лавах, мін. унутраных спраў Складкоўскі, якога Сэнат бачыў у сябе першы раз за ўвесь час...

Як толькі старшыня Сэнату, сцьвярдзіўшы павышаны кворум (лічбу прысутных, патрэбную дзеля законнасьці галасаваньня), прыступіў да дыскусіі над зьменай Канстытуцыі (справа самаразьвязаньня Сойму і Сэнату бяз дэкрэту Прэзыдэнта аб роспуску), як зараз-жа п. міністар папрасіў слова.

Старшыня: Ці п. міністар хоча прамаўляць перад дакладчыкам, ці пасьля яго?

Мін. Складковскі. Перад дакладчыкам.

Атрымаўшы слова, міністар, у парадным генаральскім мундзіры, узышоў па трыбуну і сказаў:

„Ад імя п. Прэзыдэнта Рэспублікі прашу паноў выслухаць яго распараджэньне: —

„На падставе арт. 37 канстытуцыі зачыняю надзвычайную сэсію Сэнату. Варшава, 13 ліпня 1927 г. Ігнат **Мосьціцкі**, Прэзыдэнт Рэспублікі. **Язэп Пілсудскі**, маршалак, старшыня Рады Міністраў".

Прачытаўшы гэты акт, міністар пакінуў Сэнат.

Старшыня Сэнату зачыніў паседжаньне, дадаўшы, як піша карэспандэнт „Дзен. Віл.", што ён „павядоміць сэнатараў аб скліканьні наступнай сэсіі Сэнату ў хуткім часе"...

У калідорах гмаху Сойму і Сэнату сабралося шмат паслоў і сэнатараў, страшэнна абураных ды ўсхваляваных зачыненьнем сэсіі Сэнату, спадзяючыся — і слушна!—такогаж лёсу і для Сойму...

„Прадстаўнікі народу" пачалі радзіцца, каб неяк задэманстраваць проці ўраду... Высоўваліся думкі аб супольнай заяве пратэсту на імя п. Прэзыдэнта, аб скліканьні паседжаньня Сойму, на якім зрабіць пастанову аб самаразьвязаньні яго, і г. д. Але—ведама-ж! „прадстаўнікі народу" ня маюць досьць адвагі дый баяцца „бата"...

Тым-часам у 8 гадзін. вечара адбылася нарада ў Бэльвэдэры—быццам у справе Сойму... А ў 9 гадз. у Сойм ужо зьявіўся... паручык Зацьвіліхоўскі, асабісты сэкрэтар прэм'ера, які папросту аддаў старшыні Сойму пісьмо ад п. Прэзыдэнта, у якім быў дэкрэт аб спыненьні сэсіі Сойму...

Навет не дачакаліся, каб ад імя Прэзыдэнта прачытаў хто з міністраў гэты дэкрэт, як гэта робіцца ўсюды!

Замест зямельнае рэформы — ваяводзкія Рады.

З выкананьнем навет таго дрэннага закону аб рэгулярнай парцэляцыі зямлі ўласнымі сіламі абшарнікаў, які быў прыняты Соймам яшчэ ў канцы 1925 г., робіцца нешта дзікае навет для такой абшарніцкай, але „канстытуцыйнай" Дзяржавы, як Польшча. Есьць закон, ёсьць рад „выканаўчых распараджэньняў" — з тых 88 штук, аб якіх казаў п. мін. Станевіч. Але на мясцох ані закон, ані міністэрскія загады аб яго выкананьні ня дзеюць. Ідзе ўсьцяж, як усьцяж сцьвярджаюць сялянскія газэты й навет „Роботнік", анархічная эгаістычная гаспадарка абшарнікаў, ідзе дзікая парцэляцыя, без усялякага нагляду адпаведных уладаў, без усялякага тасаваньня існуючых, але ня дзеючых законаў...

Аб п. міністру, які так гучна распачаў сваё „ўрадаваньне", які ў пекных мовах у Сойме абяцаў столькі ўсяго ўсякага безьзямельнаму сялянству, цяпер неяк зусім навет ня чуваць... Робяць сабе зямельную рэформу абшарнікі, як хочуць, прадаюць зямлю, каму хочуць, дый за такую цану, якую самі назначаюць. Мін. Станевіч, відаць, сядзіць у сваім габінэце, дый сумленна апрацоўвае ўсе тыя 88 выканаўчых распараджэньняў да закону аб парцэляцыі, без якіх, паводле яго словаў, ніяк ня можна правясьці рэформу ў жыцьцё... Дык працы хопіць — ня менш як на 10 гадоў...

Урэшце навет пэпэсы ня вытрымалі: яны, а побач з імі, здаецца, і розныя сялянскія групы Сойму, пастанавілі зьвярнуцца да ўраду з запытаньнем: дзе падзеўся яго міністар „рэформ рольных", дый што ён робіць, або мае рабіць далей — у справе выкананьня Закону 1925 году аб рэгуляваньні парцэляцыі?..

Рада Міністраў 10-га ліпня займалася, паміж іншым, справай стварэньня галоўнай і ваяводзкіх „радаў дзеля направы зямельнага ладу" ў Польшчы... У гэтай справе быў ужо нейкі дэкрэт п. Прэзыдэнта. Дык вось, Рада Міністраў радзілася над пытаньнем аб яго пераглядзе...

Адным словам — выкананьне зямельнай рэформы ў Польшчы ідзе „пад поўным парам".

„Дыплём“ п. Чэстэртона.

Ведамы англійскі пісьменьнік Чэстэртон адзін з павадыроў англійскага кансэрватызму, на старасьці гадоў запаліўшыся каталіцкім клерыкалізмам,—зрабіўся асаблівым прыхільнікам сучаснай Польшчы. Побач з Чэмбэрленам, ён хоча рашуча паправіць даўнейшую, выробленую Лёйд-Джорджам, лібараламі і Мак-Дональдам, благую апінію Англіі аб Польшчы. Спэцыяльна прыяжджаў гэты Чэстэртон у Польшчу, дзе польскае грамадзянства і ўрад цацкаліся з ім, як з нейкай каралеўскай асобай, добра разумеючы, якую карысьць мецімо праца Чэстэртона для „ўстабілізаваньня Польшчы ў апініі сьвету“.

Быў гэты п. Чэстэртон і ў Вільні, аглядаў, акружаны шчыльным мурам польскага выбарнага грамадзянства, розныя „забыткі“ ў Вільні, Троках і г. д. Усюды ў Польшчы гэты „прагавіты дасьледчык і прапагандыст праўды аб Польшчы“ быў выключным „польскім гасьцём“ — быў госьцем польскага грамадзянства і ў Вільні і наагул на нашых шматпакутных „крэсах“. І цікавіўся гэты пан запраўды-ж выключна толькі польскай праўдай аб Польшчы. Бо ані сам ня шукаў нікога, апрача палякоў з іх пекнай культурай, ані нікому, апрача палякоў, ня можна было ўгледзіць п. Чэстэртона ў Вільні, каб паказаць яму якуюсь мо' іншую праўду аб Польшчы—„ня—польскую“.

Цяпер, паехаўшы сабе дамоў у Лёндан, гэты „найсумленьнейшы з палітычных дасьледчыкаў“ дый найталентнейшы з мастакоў сучаснай англійскай літэратуры пачаў свае пісаньні ды лекцыі—аб усім тым, што ён бачыў у Польшчы, захвалёваючы Польшчу так, што навет самім найбольш сумленным паляком робіцца неяк нялоўка за гэткую яго „веру ў Польшчу“, дый за „праўду аб Польшчы“.

Вось, толькі-што ў Лёндане п. Чэстэртон прачытаў лекцыю пад назовам: „Што такое Польшча?“. Як сьцьвярджаюць у захапленьні польскія карэспандэнты, лектар заявіў, што ўсё, што ён бачыў на мейсцы, змушае яго прызнаць, што Польшча — „адна з дзяржаваў, якія йдуць у адным радзе з тымі нямногімі дзяржавамі, што зьяўляюцца павадырамі чалавецтва“.

Цяпер ужо дык кожны польскі ўрадовец ці паліцыянт на нашых „крэсах“, якіх так крытыкавалі навет у Варшаве, ды ня толькі апазіцыйныя ды меншасьцёвыя пaслы, але і самі лявіцовыя ды правіцовыя паны міністры,—можа быць спакойны, лічучы сябе згодна з „дыплёмам“ п. Чэстэртона — „павадырамі чалавецтва“.

Лекцыю п. Чэстэртона, ну, ведама-ж, адчыніў ды зачыніў польскі пасол у Лёндане, п. Скірмунт, — той самы, што корміць у Лёндане смачнымі абедамі „бедных“ каралеўскіх матак — за грошы „багатага“ сялянства Польшчы. П. Скірмунт спрытна запрапанаваў усім прысутным самім паехаць у Польшчу, каб сваімі вачыма пабачыць, што такое сучасная Польшча, як гэта зрабіў п. Чэстэртон. Адным словам: „павадыры людзкасьці“ працуюць спрытна!

Вецер з Ватыкану.

Эндэцкая „Газ. Варш. Поранна“ друкуе нязвычайна цікаўныя рэвэляцыі ў справе таго процірадавага ажыўленьня, якое ў апошніх часох выявілася сярод расейскіх манархістаў—з аднаго боку, ды сярод беларускіх і ўкраінскіх буржуазных партыяў — з другога.

Паводле інфармацыяў газэты, пачын адарваньня ад Радавага Саюзу Радавае Украіны і Радавае Беларусі, каб аб'яднаць іх з Польшчай, выходзе з дзьвюх крыніцаў: ня толькі з Лёндану, аб чым добра ведама кожнаму, але і—з Рыму, ці тачней — з Ватыкану, ад папскага двара. Паскольку Англія імкнецца да разьбіцьця Радавага Саюзу ўсё-роўна якім спосабам, — пастольку папская палітыка носіцца з думкай — шляхам адарваньня Беларусі й Украіны ад СССР пашырыць на гэтых землях **панаваньне каталіцкае царквы, наварачываючы праваслаўнае беларускае і ўкраінскае насяленьне — на унію.** Газэта падае імёны блізкіх да папы кс. Генокі і езуіта Бона, якія спэцыяльна працуюць у гэтым кірунку. Аказваецца, паміж іншым, што адначасна з заняцьцем Кіева марш. Пілсудскім туды быў прыехаў з місыйнымі мэтамі кс. Генокі. Характэрна, што і ў англійскім міністэрстве замежных спраў вядзе энэргічную прапаганду на карысьць „падзелу Расеі“ **каталіцкі дзеяч**, віцэ-міністар Віліям Тырэль. Думку аб **„крыжавым паходзе“ проці СССР** пашыраюць у Англіі перадусім **каталіцкія палітыкі.** У сувязі з гэтым знаходзіцца і сёлетні прыезд у Польшчу сьпярша кардынала, прымаса Англіі, Бурна, пасьля—зусім нядаўна — „баявога каталіцкага пісьменьніка“ Чэстэртона.

Адначасна выяўляецца ажыўленьне і сярод расейскіх манархістаў, якія—пад уплывам англійскага ўраду — у апошніх часох асабліва пачалі кратацца. Гэтак у выдаванай у Парыжу расейскай газэце „Русское Время“ зьмешчана характэрнае адкрытае пісьмо ведамага расейскага публіцыста Баяна, які заклікае марш. Пілсудскага да „сьвятое вайны“ з радавымі сарацынамі“. Баян **кліча Пілсудскага да чыннае інтэрвэнцыі** „ў імя цывілізацыі“—каб „вызваліў славянства і ўсё насяленьне (СССР) ад бальшавіцкага раскладу“. І навет сярод такіх ворагаў бальшавізму, як павадыр расейскіх кадэтаў, Мілюков, заклікі Баяна выклікалі рашучыя пратэсты проці сувязі з Польшчай дзеля паходу на СССР, проці якіх выступаюць і францускія газэты „Авэнір“ (у Парыжу) і „Журнал дэ Жэнэв“ (у Жэнэве).

Ці ідэя папскіх палітыкаў знойдзе ў Польшчы падтрыманьне? Ці шчодра раздаваныя польскім біскупам кардынальскія капялюшы і візыты англійскіх каталіцкіх дзеячоў дапамогуць зьдзейсьненьню лятуценьняў Ватыкану і... расейскіх манархістаў? На гэтыя пытаньні трудна сягоньня адказаць. Але, дзякуючы рэвэляцыям „Газ. Варш. Пор.“, нам цяпер ясна, чаму ў Заходняй Беларусі тварцом і павадыром **„проці-менскага курсу“** аказаўся акурат прадстаўнік каталіцкага кліру—кс. Станкевіч: апрача ўплываў ковенскіх калегаў яго, якія зацікаўлены змаганьнем з цягай да Менску з увагі на свае ўласныя палітычныя імкненьні (прывабіць беларусаў да Коўны!), тут, бясспрэчна, адыгралі ролю і **беспасярэднія ўплывы Ватыкану.**

Мы зусім разумеем, якія вялікія надзеі ўскладае папская палітыка на ролю Польшчы ў паходзе каталіцтва на Усход. Але ці Польшча адважыцца паставіць на карту самае сваё дзяржаўнае існаваньне ў імя інтарэсаў каталіцтва — ну, гэта ўжо другое пытаньне...

Проці англійскіх плянау.

Справа далучэньня Францыі да англійскага пляну процірадавага фронту ніяк не „вытанцоўваецца“... Наадварот, з усіх бакоў ідуць весткі, быццам Чычэрыну ўдалося неяк паразумецца з францускім урадам у справе ўзнаўленьня перагавораў аб даўгох і тарговым дагаворы. З другога боку частка францускай прэсы — больш радыкальная — добра разумее, што ўмешывацца ў канфлікт між Англіяй і Радамі, дый яшчэ выразна становячыся на англійскі бок, — зусім нявыгадна для Францыі. Апрача кампрамітацыі, гэта нічога ня дасьць, бо-ж усё роўна францускія работнікі не дазволяць францускаму ўраду вясьці агрэсыўную палітыку проці Радаў.

Цікаўны артыкул зьмясьціла ў гэтай справе левая радыкальная часопісь „Эр Нувэль“ (Новая Эра), ведамая беларускаму народу сваім гарачым пратэстам проці белага тэрору ў Польшчы. Трэба адзначыць, што газэта гэная — блізкая да павадыроў радыкальнай партыі, якая здабыла вялізарную большасьць на апошніх выбарах у Парлямант, ды мае вялікія ўплывы ў краі... З аднаго боку, газэта востра крытыкуе радавы ўрад, які сваім тэрорам можа толькі расхістаць сваё палажэньне ў СССР. Але, з другога боку, газэта перасьцерагае эўрапэйскія ўрады, каб яны не правакавалі аружнага канфлікту з Радамі. Бо адзіным рэзультатам гэтага правакаваньня, апрача ахвяраў тэрору, будзе далейшае агітаваньне работніцкіх масаў Эўропы Радавым урадам, які лоўка выкарыстае пагрозу існаваньню адзінай работніцкай дзяржавы ў сьвеце, — клічучы на помач работнікаў усіх краёў... Дык ня трэба нейкмі тайнымі рухамі даваць матэрыял для гэтай агітацыі, якая будзе толькі ўсьцяж паглыбляць прорву між буржуазнымі ўрадамі і работніцкімі масамі на Захадзе...

Што-ж датычыць выразнага саюзу Францыі з Англіяй, які-б меў на мэце стварэньне проці-радавага фронту, дык газэта рашуча выступае проці яго. Хай сабе Англія сама выкручываецца з свайго канфлікту з Радамі, ня ўцягіваючы ў гэту справу Францыі. Ані Францыя, ані СССР, маючы даволі ворагаў, не патрабуюць яшчэ ствараць сабе новых, дый яшчэ дзеля Англіі...

Бюджэт СССР—5 мільярдаў рублёў.

Камісарыят Фінансаў СССР не апублікаваў яшчэ дакладных лічбаў даходаў і выдаткаў, прадбачаных на наступны год. Але ў загранічнай прэсе — на падставе радавых крыніцаў — зьявіліся ўжо гэтыя бюджэтныя аблічэньні ў галоўных круглых лічбах.

Паводле гэтых лічбаў, даходы СССР аблічаны агулам на **5 мільярдаў 2 мільёны 373 тысячаў рублёў.** У тым ліку: з падаткаў — 2,333,567,000, з дзяржаўных прадпрыемстваў—2,416,807,000. Апрача таго розныя іншыя крыніцы даюць яшчэ 252 мільёны.

Як бачым, бюджэт СССР пабудаваны амаль не напалову на падатках і даходах з дзяржаўных прадпрыемстваў, што трэба лічыць больш-менш нармальным.

Калі прыраўнаваць яго да сёлетняга бюджэту Польшчы, дык пабачым, што ў ім (як прыблізна таксама, як і ў папярэднія гады)—на 1 мільярд 985 мільёнаў злот усіх даходаў — падаткі (пасярэднія і беспасярэднія) складаюць аж 1.699 м. злот., а толькі 286 мільёнаў даюць дзяржаўныя прадпрыемствы... Гэткім чынам у Польшчы падаткі даюць каля 87 прац. дзяржаўных даходаў, а толькі крыху больш за 13 прац. даюць дзяржаўныя прадпрыемствы. Інакш кажучы, страшэнны цяжар утрыманьня дзяржавы кладзецца ў Польшчы амаль ня выключна на насяленьне. А калі прыпомнім, што найвялікшая частка гэтых падаткаў—у форме пасярэдніх—спаганяецца пераважна з працоўнага насяленьня, дык пабачым, што, як сцьвярдзіла ў свой час уся радыкальная прэса,—„бюджэт Польшчы апіраецца ў сваей львінай долі на спажыўцох, на масах працуючых“.

Што-ж датычыць бюджэту Радаў,—дык у ім пасярэднія падаткі складаюць толькі 773 мільёны, ці каля 15.5 прац.

Ганьба ўсіх „славянскіх бюджэтаў“, — гэта даход ад гарэлачнай манаполіі... Навет Рады, дзе ў першыя гады рэвалюцыі гарэлка была зусім забаронена (—пілі толькі самагон, ды труціліся яшчэ горш!) цяпер маюць у сваім бюджэце, як калісьці ў царскім, даходу ад казённай манапольки аж 400 мільёнаў руб. у 1925 г., дый аж 575 міл. — у 1926 г. А на 1927—1928 прадбачыцца, відаць, яшчэ больш...

Выдаткі ў бюджэце СССР зраўнаважаны з даходамі. З іх каля паловы йдзе на ўтрыманьне ўрадавага апарату. Ваеннае міністэрства бярэ 675 міл., ці каля 15.4 прац.

У Польшчы на ваеннае міністэрства ідзе больш трэціны ўсяго бюджэту, затое на аплаце працы ўрадоўцаў робяцца паважныя ашчаднасьці...

Польшча і Літва.

Вельмі цікаўную вестку аб польска-літоўскіх перагаворах друкуе бэрлінская газэта „Дэўтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг“. Паводле вестак, атрыманых з Рыгі, газэта піша, быццам у апошніх часох **адбываліся беспасярэднія перагаворы паміж Літвой і Польшчай,** каб дайсьці да нейкае згоды паміж імі. Здаецца, што гэтыя перагаворы заканчываюцца і што дасягнена паразуменьне. Падставай гэтага паразуменьня мае быць абмен нотамі паміж Літвой і Польшчай, пры чым у літоўскай ноце была-бы зьмешчана заява аб спыненьні стану вайны між гэтымі дзяржавамі, ды Польшча і Літва заявілі-бы аб узаемным прызнаньні сябе. Літва мела-бы зрачыся сваіх засьцярогаў адносна да Вільні.

Паводле тэй-жа газэты, у дыпляматычных колах лічаць, што весткі гэтыя выпярэдзілі факты. У кожным разе, **перагаворы запраўды нядаўна адбываліся,** але аб выніку іх нічога памыснага нельга сказаць.

Ну, справа не такая простая і лёгкая, каб, навет згаварыўшыся, можна было адкрыта прызнацца да тайнае ўгоды!

Францыя і Нямеччына.

Трыумф нямецкага ўраду.

10 ліпня францускі ўрад выдаў афіцыяльны камунікат, які сцьвярджае ясна і выразна, што Нямеччына цалком выпаўніла ўсе абявязкі, якія выплывалі з лёнданскай умовы 31 студня 1927 г.—у справе збурэньня крэпасьцяў на ўсходніх рубяжох Нямеччыны.

Гэткім чынам урад п. Пуанкарэ перад усім **сам сябе высьцябаў публічна,** як тая гогалеўская „ўнцэрская ўдава“... — Бо ж яшчэ колькі дзён назад прэм'ер Пуанкарэ ў сваей вялікай палітычнай прамове закідаў немцам, быццам яны ашукалі саюзьнікаў, збурыўшы гэтыя крэпасьці толькі дзеля віду...

Цяпер сама француская прэса разумее, што, маючы такі дакумэнт „з паквітаваньнем“ у руках, Штрэзэман зараз-жа пачне дамагацца ад Францыі таксама споўненьня абяцанага яе прадстаўнікамі ў Лёкарно скасаваньня акупацыі Рэйну. Праўда, гэтае абяцаньне было дадзена на славах—бяз ніякага сьледу ў афіцыяльным дакумэньце, але,—як пішуць францускія газэты, навет рэакцыйна-нацыяналістычныя,—„гонар Францыі загадывае споўніць гэтае прырачэньне“... З аднаго боку—„гонар“, але з другога няменш сільна націскаюць на Францыю і матывы больш рэальныя ды беспасярэднія: бясспынны ўзрост мілітарнай, фінансава-прамысловай і наагул палітычнай сілы Нямеччыны, якой ня стрымаеш ужо надалей ані гнілымі вяроўкамі струхлеўшага „трактату“, ані навет зялезным ботам акупацыі... А толькі-што Францыя зразумела і гаспадарчую сілу і значэньне для яе Нямеччыны, калі тая не задумалася навет абвясьціць Францыі гаспадарчую вайну.

Хочаш-ня хочаш, а лічыцца ды ўступаць трэба. А гэта-ж кажа рабіць і „гонар“, дык—тым ляпей...

Францускі міністар жаліцца на няўступлівасьць Нямеччыны.

Гаспадарчы трактат між Францыяй і Нямеччынай, тэрмін якога скончыўся 1 ліпня, усё ня можа наладзіцца. Францускі ўрад думаў, што справа ўзнаўленьня трактату пойдзе таксама гладка, як калісьці—у баечныя часы першых гадоў пасьля міру. Але немцы раптам паказалі Францыі свае зубы ды пазуры, якія адрасьлі ізноў за гэты час. Цяпер францускі ўрад, каб не руйнаваць сваіх фінансаў, з такімі высілкамі наладжаных Пуанкарэ, просіць, каб немцы хаця б падпісалі часовы дагавор — на тры месяцы... І вось, сам міністар Бакановскі, які з боку Францыі вядзе гэтыя перагаворы, сцьвярджае, што яны йдуць у такой „цяжкой атмасфэры“, ды сярод такіх немагчымых труднасьцяў, што „цяжка думаць, каб яны да восені дайшлі да канца.—хаця Францыя робіць ўсё, што толькі можа“...

Нямеччына не адстане ў збраеньнях ад іншых...

Камуністычны пасол Шнэлер у газэце „Ротэ Фанэ“ (Чырвоны Сьцяг) зьмясьціў цікаўны артыкул, у якім даводзіць, што нямецкая палітыка зусім ня йдзе ў кірунку разбраеньня, але наадварот—ідзе ў напрамку зраўнаньня сваіх збраеньняў з саюзьніцкімі... Нямецкія збраеньні толькі ўрад добра прыкрывае.

У апошні час збраеньні ўзрастаюць асабліва хуткім тэмпам. Выпаўняючы фармальна ўсе загады Вэрсальскага Трактату, немцы знайшлі добрыя спосабы па сутнасьці абмінаць усе яго забароны... Ідзе фактычнае павялічэньне лічбы і сілы арміі і флёту, ідзе і фактычнае датарнаваньне ўсей нямецкай прамысловай гаспадаркі да патрэбаў найшырэйшай ваеннай акцыі, ды ўрэшце — мілітарызацыя ўсяго насяленьня краю на выпадак вайны...

Трактаты забараняюць выраб ваенных матэрыялаў у Нямеччыне,—добра! Але найвялікшыя нямецкія фірмы, якія выраблялі гэтыя матэрыялы да вайны, маюць цяпер свае „аддзяленьні“ ў прыязных да Нямеччыны краёх — у Галяндыі, Швэцыі, Турцыі (ня кажучы ўжо аб СССР, аб якім Шнэлер чамусьці не ўспамінае). Гэтыя аддзяленьні нямецкіх фірм па-за межамі краю працуюць пад бліжэйшым кіраўніцтвам афіцэраў нямецкага штабу...

Да ўсяго гэтага нямецкая камуністычная прэса даносіць, быццам армія (рэйхсвэр) мае быць павялічана з 100 тысячаў на 400 тысячаў. Зброя гэтай арміі будзе палепшана ўсімі навейшымі срэдствамі ваеннай тэхнікі. Ваенныя фабрыкі працуюць над гэтым усьцяж...

Цяжка забараніць „былому пераможанаму“ ўсё тое, што „былыя пераможцы“ робяць самі... Калісьці, у часе Напалеона, гэты ўладар Заходняй Эўропы, разграміўшы нямецкія дзяржавы, забараніў, паміж іншым, Прусіі трымаць сталае войска. Дык Прусія адказала на гэтую забарону тым, што выдумала агульную вайсковую павіннасьць, якую пасьля пераянялі ад яе амаль ня ўсе народы сьвету...

Мары і зданьні з часоў Вялікай вайны.

Няўхільнасьць ды блізкасьць скасаваньня францускай акупацыі нямецкай зямлі, што пэўна-ж адчыніць новую старонку ў гісторыі паваеннай Эўропы, высуваючы на першы плян найбольш эканамічна і палітычна актыўную і зусім вольную ды самастойную Нямеччыну, — мусіла занепакоіць усіх тых францускіх дзеячоў, якія ў свой час, дарваўшыся да паваленай сіламі ўсяго сьвету Нямеччыны, пачалі—на вачох ўсяго, абуранага ўжо не на Нямеччыну, але на Францыю, сьвету руйнаваць і дабіваць яе мілітарна й гаспадарча, думаючы, што гэтым забясьпечаць новы палітычны расцьвет выміраючай Францыі... У гэты мамэнт высоўваецца ізноў жудасная фігура маршалка Фоша... Надовячы Фош запрасіў да сябе на гутарку англійскіх журналістаў, якім і выклажыў усе тыя небясьпекі, якія пацягнуць за сабой далейшыя ўступкі саюзьнікаў Нямеччыне.

„Калі ня будуць ізноў прыняты надзвычайныя меры проці ўзросту сілы Нямеччыны, дык трэба сказаць сабе проста і адкрыта, што ў працягу 15, а найбольш 20 гадоў **выбухне ізноў сусьветная вайна**“...

Але-ж якраз той самы Фош, побач з Пуанкарэ і Клемансо, зрабіў—сваім Вэрсальскім Трактатам усё, каб гэтая вайна была **нямінуча!**

Адчайнае палажэньне Чанг-Тсо-Ліна

З Пэкіну пішуць, што палажэньне магутнага яшчэ так нядаўна дыктатара Паўночнага Кітаю Чанг-Тсо-Ліна—цяпер зрабілася адчайным.

Вельмі значная частка яго войск, якая знаходзіцца на поўначы Шантунгу, раптам растаяла, як сьнег на сонцы: адзін за адным генаралы, камандуючыя гэтым вайскам, пераходзяць на бок Чанг-Кай-Шэка. Пацьверджана вестка аб тым, што места Цін-Дао аддана камэндантам бяз бою камандаваньню паўдзённых арміяў. Рэшткі арміі Чанг-Тсо-Ліна, верныя яму, загнаны ў клін між Хванг-Хо і берагам Жоўтага мора, ды ня сёньня-заўтра будуць скінуты ў мора, калі не падбяруць іх японцы на свае караблі.

Страшэнныя баі ідуць на абароннай лініі паўночнай арміі—ўздоўж чыгункавай лініі Ці-Нан-Вэй, але гэтая лінія ўжо ў шмат мясцох прарвана Чанг-Кай-Шэкам. Прарыў гэтай апошняй перад—Пэкінам—лініі абароны прадстаўляе рашаючы мамэнт у барацьбе за сталіцу Кітаю, а можа і ў усей барацьбе між Поўднем і Паўночай гэтага вялізарнага краю. Заняцьце Пэкіну зрабілася **справай некалькіх дзён!..**

Пагроза Пэкіну, куды толькі-што—з вялізарнай помпай—пераехаў з усім сваім „дваром“ Чанг-Тсо-Лін, яшчэ хутчэй прысьпяшае яго поўны разгром: здрада навакол яго ня спыняецца, і кожны новы пасьпех паўдзённых войск спараджае іх па некалькі ў дзень. А галоўна—тое, што гэтыя здрады на фроньце, як мы прадбачылі задоўга згары, адбіваюцца гулкім „рэхам“ у тылох, дзе ўзьнімаюцца ўсё шырэй паўстанчыя рухі—проці ненавіснага хунхуза-дыктатара-найміта, і на здушэньне гэтых рухаў у Чанг-Тсо-Ліна не хапае ўжо ані сваей, ані японскай паліцыі.

Пасьля прарыву лініі Хванг-Хо паўстаньне ахапіла адразу вялізарныя абшары напоўнач ад гэтай лініі. А гэта адразу зрабіла недарэчнай прапазіцыю Японіі, якая запрапанавала абодвум Чангам зрабіць замірэньне на падставе дэмакрацыйнай лініі Хванг-Хо. Гэта-ж была апошняя лінія, якая ратавала яшчэ сядзібу Чанг-Тсо-Ліна ў Пэкіне, і гэтай лініі цяпер ужо няма!

З гэтага мы бачым, з якой шпаркасьцяй разьвіваюцца ваенныя і ўсялякія здарэньні ў Кітаі, ня глядзячы ня яго вялізарныя адлежнасьці. Бачым і тое, што падыходзіць рашучы мамэнт у ліквідацыі хатняй вайны ў Кітаі, калі не пачнецца новая, ужо сусьветная вайна на Далёкім Усходзе, якую можа наважыцца запаліць **Японія.**

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Польскі пасол з Масквы ў прэм'ера.

Польскі пасол у Маскве, п. Патэк, быў 12 ліпня прыняты прэм'ерам Пілсудскім, з якім веў гутарку—аж паўтары гадзіны.

Дэкрэт аб пазыцы ў „Дзеньніку Законаў".

У чарговым нумары „Дзеньніка Устав" апублікаваны дэкрэт п. Прэзыдэнта аб пазыцы 15 мільёнаў. 4 артыкулы дэкрэту выясьняюць варункі пазыкі. Дэкрэт мае быць — паводле закону—пададзены ў Сойм — на зацьверджаньне.

„Знай нашых"!

Тэлеграма з Лёндану паведамляе з шыкам:

Польскі пасол Скірмунт даў парадны абед у чэсьць... маткі гішпанскай каралевы Бэатрысы, пасьля чаго ў салях пасольства адбыўся вялікі баль, на які сабралася больш за 200 асоб выбранага лёнданскага грамадзянства: паслы замежных дзяржаў, міністры, дэпутаты, лёрды, прадстаўнікі фінансаў, арміі, прамысловасьці, гандлю, і — віцэ-дырэктар Англійскага (дзяржаўнага) Банку.

Што пэўныя афіцыяльныя асобы, а перадусім дзеячы фінансавыя ды банкіры патрэбны польскаму ўраду ў сучасны мамэнт, гэта—зразумела. Але вось, чаму польскі пасол у Лёндане выкідае пэўна ж вялізарныя грошы, спаганяныя з галадаючага працоўнага люду Польскай Рэспублікі, на каштоўнае частаваньне нейкіх каралеўскіх матак—з краёў, з якімі Польшча бадай ніякіх супольных спраў ня мае,—гэта дык пытаньне пікантнае!

„Апазыцыйны стыль" пэпэсаўскага „Роботніка".

Стыль пэпэсаўскага галоўнага органу „Роботніка" — ад часу пераходу ППС у „вострую і адкрытую апазыцыю"—зрабіўся надзвычайна забойчым. — З паасобнымі панамі міністрамі „Роботнік" дык зусім не цэрамоніцца...—З такімі, напрыклад, панамі-манархістамі, як Незабытоўскі й Мэйштовіч, панэ „эсы" ды „эсікі" з „Роботніка" размаўляюць такім „палючым" тонам, што папросту няведама, чаму і як гэтыя паны-міністры яшчэ жывуць, працуюць і—не зварачаюць на папю „апазыцыю" ніякай увагі?! „Расьпякаючы" пана міністра тэлефонных лічнікаў, Медзіньскага, „Роботнік" так і сыпле, — „цо то, до ліха", ці—„до д'ябла"... Не хапае толькі нацыянальна-польскай „холеры"...

Але... але вось, ня гледзячы на сваю „канстытуцыйнасьць", паводле якой усе міністры наагул адказываюць салідарна, як Урад, а перш й перадусім адказывае за ўсіх міністраў Старшыня ўраду, прэм'ер, — паны „апазыцыя" з ППС блізу ніколі ня ўжываюць наагул прозьвішча пана Старшыні Рады Міністраў. А ўжо літэральна зусім забыліся аб тым, што ў сучасным урадзе п. п. Мэйштовіча, Незабытоўскага, Медзіньскага ды іншых, ня кажучы ўжо аб іх адказным Галаве, ёсьць, напрыклад, пан, ці, перапрашаем, здаецца, дагэтуль яшчэ „таварыш" Морачэвскі, які й па сёньняшні дзень ня выключаны з партыі ППС... Апрача яго, у розных дэпартамантах таго-ж ураду п. п. Незабытоўскіх ёсьць на платных мейсцах шмат чынна-партыйных пэпэсаўскіх галоў ды „галовак"... Дык вось, аб іх, аб іх дзеяльнасьці апазыцыйны „Роботнік"—хаця б калі, дзе, што якое сказаў! — Ніколі, нідзе, нічога, а ніяк!... А пачытайце перадавіцы п. Мячыслава Недзялковскага, — дык проста забойчыя!... Але—якi ў іх дэлікатна-тэорэтычны стыль... Можна быць пэўным, што ўсе паны міністры з вялікай прыемнасьцяй чытаюць перадавіцы п. Недзялковскага, галоўнага рэдактара „апазыцыйнага" „Роботніка".

Заграніцай.

Англійская разьведка на граніцы ССРР.

Бэрлінскі карэспандэнт „Известий" паведамляе, што, паводле пэўных крыніц, у Коўну прыехаў англійскі афіцэр Нэсбіт, які зьяўляецца віцэ-шэфам англійскай разьведкі. Гэты афіцэр мае даручэньне аб'ехаць усе балтыцкія дзяржавы, каб выясьніць баявую сілу іх арміяў і магчымасьці — на выпадак вайны — памагчы Англіі. У Літве англійскі афіцэр меў нарады з адказнымі кіраўнікамі ўраду і арміі—у справе надзяленьня літоўскай арміі англійскай артылерыяй і амуніцыяй, а так-жа аб тым, ці ня можна было-б зрабіць тутака базу (падставу) для англійскага паветранага флёту?

Аб'яднаньне дзяржаўных банкаў.

На канфэрэнцы дырэктароў дзяржаўных банкаў Амэрыкі, Англіі, Францыі і Нямеччыны, якая адбылася ў Нью-Іорку, пастаноўлена—па прапазіцыі Амэрыканскага Фэдэральнага Банку — стварыць аб'яднаньне гэтых банкаў, да якога маюць далучыцца яшчэ звыш дзесятку эўрапэйскіх банкаў. Гэтае аб'яднаньне банкаў будзе вырашаць—з пункту гледжаньня ня толькі фінансавага, але і міжнародава-палітычнага,—усе справы крэдытнай дапамогі паасобным дзяржавам... Трэба думаць, што, побач з справай гаспадарчай адбудовы сьвету, гэты новы орган адбудаваўшайся сусьветнай буржуазіі захоча — пад кіраўніцтвам Англіі — спрабаваць сваю сілу і над ССРР...

Усюды апякунчая рука англійскіх палітыкаў!

На „вугальных тылох" Англіі.

Англіі ізноў пагражае страшэнны вугальны крызіс. Яе вугальная прамысловасьць, якая зьяўлялася заўсёды падставай яе гаспадарчага разьвіцьця й фінансавай сілы, усьцяж занепадае. Усе думкі аб яе адбудаваньні пасьля ваеннага застою аказаліся пустымі. Усе страшэнныя фізычныя і маральныя гвалты над работнікамі, якімі была зламана леташняя забастоўка вуглякопаў, прапалі дарма. Адно па адным зачыняюцца вугальныя прадпрыемствы. Ужо 2 месяцы, як што-тыдзень выкідаецца па 10,000 вуглякопаў з працы... Дык ясна, што, апрача гаспадарчай катастрофы, у Англіі падрыхтоўваецца і страшэнны сацыяльны крызіс. Чым ён скончыцца — няведама...

Англійцы б'юць трывогу.

Англійская прэса б'е трывогу з прычыны ўсё ўзрастаючай небясьпекі англійскаму панаваньню ў Азіі. Асабліва нэрвова англійцы сачаць за ўзростам паўстанчага руху й „расейскай небясьпекі" ў Індыі. Бо ведама-ж, страта Індыі адразу зробіць Англію другараднай дзяржавай у сьвеце. Прэса сцьвярджае, што ўсе „ўплывы" на Афганскага эміра — (у яго кішані) з боку Англіі (яе скарбу!) ня могуць устрымаць узрастаючай сілы ССРР у Афганістане. Дык гэзэты заклікаюць, пакуль яшчэ ня позна, хутка стварыць значную ваенную базу з вялікай сталай арміяй— з англійскага боку Афганістану, каб бараніць праход у Індыю.

Усё к аднаму: устарэлы, праступны, недарэчны імпэрыялізм англійцаў, хочучы за ўсялякую цану задушыць вызвольны рух паняволеных ім народаў, будзе — што ні рабі! — разваліваоца, а пакуль-што будзе ўсё даражэй і даражэй каштаваць англійцам, руйнуючы іх ня толькі маральна, але і фінансава.

Забойства ірляндзкага міністра.

Ірляндзкі міністар замежных спраў Сіггінс, як „выясьнена" паводле англійскіх крыніцаў, забіты партыяй рэспубліканцаў-незалежнікаў за тое, што ён, быўшы сьпярша выдатным сябрам гэтай рэвалюцыйнай партыі, пасьля перайшоў у лагер яе праціўнікаў, якія стаяць на груньце паразуменьня з Англіяй. Таксама й за тое-ж быў у 1922 г. забіты бацька Сіггінса.

Нябожчык дапамог!

Мы пісалі ўжо аб тым, што канфэрэнцыя трох марскіх дзяржаваў: Амэрыкі, Англіі і Японіі—у справе так-званага „разбраеньня на моры", а ўзапраўднасьці—аб падзеле панаваньня на акіянах, — павінна скончыцца крахам, бо кожная з гэтых марскіх дзяржаваў хоча абмяжаваць збраеньні дзьвюх другіх, але ня хоча перашкаджаць сваім уласным збраеньням... Што з гэтай канфэрэнцыі ня выйдзе нічога, ужо было ясна даўно. Трэба было толькі „прызвайтага выпадку", да якога можна было-б прычапіцца, каб—адлажыць канфэрэнцыю... І вось гэткім выпадкам зьявілася забойства ірляндзкага міністра Сіггінса, — былага дэлегата на такую-ж канфэрэнцыю ў справе абмяжаваньня марскіх збраеньняў.

Спэцыяльны камунікат канфэрэнцыі запраўды пазываецца на гэтую сьмешную прычыну, каб адлажыць палючую справу на неазначаны тэрмін... З гэтага відаць ясна, хто сарваў канфэрэнцыю ды хто больш за ўсіх іншых ня хоча абмяжаваньня збраеньняў на моры.

Англія мае крэйсэраў удвая больш, чым мае права паводле прынятай у Вашынгтоне прапорцыі, дык ясна, што яна-ж і сарвала канфэрэнцыю, прычапіўшыся да „шчасьлівага прыпадку"...

Бомба ў Кішынёўскім саборы.

Венскія крыніцы падаюць, што ў саборы ў Кішынёве (сталіца Бэсарабіі) была падложана вялікай сілы бомба, каб узарваць сабор у часе ўрачыстага багаслужэньня. Замах выкрыты загадзя.

Памёр ген. Гофман.

Памёр ведамы нямецкі генарал Гофман, які прымаў выдатнае ўчасьце ў падрыхтоўцы і вядзеньні немцамі Вялікай вайны.

Гофман быў спэцыялістам генаральнага штабу на ўсходняму фронту. Ен-жа быў старшынёй нямецкай дэлегацыі ў Бярэсьці, якая заключыла з бальшавікамі мір. Але Гофман быў да сьмерці страшэнным праціўнікам бальшавікоў, дый да апошняга часу, вышаўшы ў адстаўку зараз-жа пасьля Вэрсальскага міру, займаўся, апрача пісаньня ўспамінаў і гісторыі вайны,—апрацаваньнем—разам з нямецкім прамыслоўцам Рэхбэргам — вялікага пляну ваеннага паходу заходніх дзяржаваў проці бальшавікоў.

Новыя выбары ў парлямант у Фінляндыі.

Новыя выбары ў Фінляндыі ня вельмі зьмянілі склад яе парляманту. Паводле прыблізных падрахункаў, склад парляманту мае быць больш-менш такі: 60 сацыял-дэмакратаў, 53 аграрыяў, 33 аб'яднаныя, 24 швэды, 20 камуністаў і 10 паступоўцаў.

Капітуляцыя брата Абдэль Крыма.

У сувязі з пасьпехамі гішпанскіх войск у Марокко, адзін з выдатнейшых павадыроў паўстанцаў, брат слаўнага Абдэль Крыма Сэлітэн, які ў працягу некалькіх гадоў вёў запраўдную вайну з Францыяй і Гішпаніяй за незалежнасьць Марокко, сам зьявіўся да францускіх уладаў і заявіў, што паддаецца Францыі. Сэлітэн інтэрнаваны ў Фэце, скуль пасьля француская ўлада мае забраць яго кудысьці далей — у больш пэўнае месца.

Новыя „абнаўленчыя" япіскапы ў ССРР.

„Синодальный Вестник" падае лічбы тых япіскапаў у ССРР, якія прызналі і радавую ўладу, і новую „абнаўленчую царкву" ў ССРР.

Амаль ня ўсе новыя япіскапы — людзі паджылыя, прайшоўшыя старую царкоўную школу. — 91 з іх маюць 50—70 гадоў веку, 33—ад 30 да 50 гадоў, толькі 12 маюць звыш 70 гадоў. З усей лічбы япіскапаў 48 скончылі вышэйшую духоўную школу (—Акадэмію), 68 скончылі сэмінарыю, 4 — з сьвецкім узгадаваньнем. За выключэньнем 5, усе яны й да рэвалюцыі былі духоўнымі. 98 з іх — з „белага духавенства", 37 — манахі. 19 з іх далучыліся да „абноўленай царквы" ўжо ў сане япіскапскім, 117 атрымалі гэты высокі сан пасьля пераходу ў „абнаўленства", — быццам у нагароду за тое, што пакінулі „ціханаўскую царкву"...

Водгук справы Воевудзкага.

У сувязі з абвінавачаньнем польскай дэфэнзывай і польскімі ды беларускімі буржуазнымі партыямі пасла з НПХ Воевудзкага ў служэньні інтарэсам тэйжа дэфэнзывы, як ведама, адбыўся так-званы маршалкоўскі суд, вызначаны маршалкам Сойму. Але й суд гэты, у якім засядалі прадстаўнікі абвіненьня, ня мог пацьвердзіць праўдзівасьці кінутага паслу Воевудзкаму абвіненьня ў здрадзе сваіх цяперашніх палітычных саюзьнікаў. На гэтым судзе выявілася, што пададаныя Воевудзкім у II аддзел генаральнага штабу рэфэраты аб беларускай справе пісаў для яго ведамы ў Вільні грам. Сьвяневіч, які самахоць зьявіўся на маршалкоўскі суд і сцьвярдзіў гэты факт. За гэта „Роботнік" орган старшыні „суда" — пэпэсаўскага міністра Морачэвскага, назваў „дэфэнзыўшчыкам" ужо не аднаго Воевудзкага, але й Сьвяневіча. Тады грам. Сьвяневіч зьвярнуўся да польскага, беларускага і літоўскага грамадзянства ў Вільні з просьбай прыняць учасьце ў утварэньні грамадзкага суда над ім, Сьвяневічам, які разгледзіў-бы ягоныя рэфэраты, пісаныя для Воевудзкага, і даў бесстароннюю ацэнку іх. Ад беларусаў увайшлі ў склад грамадзкага суда беспартыйны сэнатар Уласаў і сябра „Сялянскага Саюзу" д-р Ян Станкевіч, запрапанаваны павадыром хадэкаў кс. Станкевічам. Ад літвіноў—грам. Вялецкі. Ад палякоў—рэдактар „Przegl. Wil." Людвік Абрамовіч, праф. Эрэнкрэўц, судзьдзя Ян Пілсудскі і праф. Ул. Завадзкі.

Па просьбе грамадзкага суда зьмяшчаем тутака ягоны прыгавор у справе грам. Сьвяневіча, пераклаўшы польскі тэкст на беларускую мову.

Рэзалюцыя Грамадзкага Суда ў справе грам. Станіслава Сьвяневіча.

З прычыны заметак, якія зьявіліся ў некаторых часопісях у сувязі з справай пасла Сыльвэстра Воевудзкага і ўтвораным у гэтай справе Маршалкоўскім Судом, грам. Станіслаў Сьвяневіч зьвярнуўся да грамадзян: Людвіка Абрамовіча, праф. Стэфана Эрэнкрэўца, Яна Пілсудскага, Яна Станкевіча, Казіміра Велецкага, Аляксандра Уласава і праф. Уладыслава Завадзкага — з просьбай, каб яны злажылі Грамадзкі Суд і разгледзілі закіды, якія могуць быць зроблены яму на падставе памянёных бязыменных заметак і заяваў прэсы.

На першым паседжаньні Грамадзкага Суда 8-га лютага 1927 году пад маршалкоўствам праф. Ст. Эрэнкрэўца грам. Сьвяневіч, канкрэтызуючы свой зварот да Суда, прасіў, каб Суд рассудзіў, ці „ён (Сьвяневіч), быў супрацоўнікам дэфэнзывы, і ці ягоная дзеяльнасьць, як аўтара дакладаў аб беларускім руху, дастаўляных II аддзелу генаральнага штабу праз п. Воевудзкага, мела двулічны характар і ці мела на мэце рабіць шкоду гэтаму руху"? З прычыны такога сформуляваньня пытаньня Суд выдэлегаваў сяброў

Маленькі фэльетон.

Тэрорыст.

Ужо другі тыдзень мінае з таго часу, як апошні раз арыштавалі мяне, а мае знаёмыя ўсё яшчэ не даюць мне спакою: расказвай ім ды расказвай, за што арыштавалі!

І таму скажы, і другому скажы, — проста язык забалеў расказваючы. Вось і надумаўся я цяпер аб усім напісаць у газэту, каб усе прачыталі дый больш у мяне ня пыталіся.

Дык слухайце!

Яшчэ дні за тры да арыштаў, устаючы рана, заўважыў я, што нейкі „тып" каля маіх вокнаў ходзе, ды ўсё на вокны паглядае, быццам ён праз вакно да мяне ўлезьці хоча.

Вышаў я на вуліцу, а ён за мной — і ходзіць, як цень мой па пятах.

Я направа.—Ен направа.

Я налева.—Ен налева.

Куды я,—туды ён...

— Чаго, думаю, ён за мной ганяецца? Ці ня злодзей які?!

Мац я тагды за кішаню, а ў кішані пуста.

— Ну, думаю, абдурыў я цябе; каля мяне, брат, не пажывішся!

Варочаюся дамоў. А „тып" крок у крок мяне да хаты праваджае...

Выхаджу ў поўдні на абед. Гляджу, а ўжо на вуліцы двох „тыпаў" за мной сочаць.

Я спыняюся купіць газэту, — яны папіросы таргуюць.

Я чытаю абвестку на сьцяне, — яны тавар у вакне крамы разглядаюць.

Сеў я абедаць за адзін столік,—яны за суседні садзяцца.

— Чаго яны ад мяне хочуць?—усьцяж ламаю галаву і ніяк да нічога дадумацца не магу.

Чалавек я бедны. Нідзе, ніколі, нічым, ніякім не адзначыўся. Чаму-ж, думаю, нада мной раптам такая апека пастаўлена?

Іду з абеду, аж на вуліцы трэцьці „тып" да гэтых двох далучыўся.

Ідуць яны за мной. А я сабе іду дый пасьмейваюся: вось, думаю, гонар які! Як за каралём з-заду сьвіта ходзе.

Ламаю галаву, ламаю. Аж урэшце:

— Ага! Гэта-ж у суботу каранацыя будзе! Сам Прэзыдэнт дзяржавы і маршалак Пілсудскі да Вільні прыедуць! А таксама міністры, кардыналы і шмат іншага народу будзе. Граніцы для літвіноў і латышоў паадчынялі, а нам беларусам — гаспадаром гэтага краю... пачэсную асыстэнцыю вызначылі.

Вось што!

Але чалавек я просты, ніякіх чыноў, крыжоў, ордэноў і мэдаляў ня маю. Хутка збрыдла мне гэта „пачэсная апека". Я ў ногі. Яны за мной...

Бягу, бягу дый аглядаюся, а яны за мной, як ганчакі ганяюцца...

Позна вечарам пайшоў я ў сталоўку. Там спаткаўся з сваімі таварышамі. Толькі мы селі за супольную вячэру, аж... знаёмыя „тыпы" тут, як тут, але ўжо ня ў трох, а ў пяцёх. Сядзяць, газэты чытаюць, дый да нас, як да эскімосаў якіх, прыглядаюцца.

— Гаспадар! Бомбу вялікую дайце! — крыкнуў адзін з таварышоў.

Прынесьлі вялікі куфаль піва.

Але ўжо ня было каму піць. Як з пад зямлі вырасла „мундуровая" паліцыя і яшчэ штук з пяток „тайных". Акружылі нас, абыскалі, дый павялі...

— Куды?

— Як куды?! На вышэйшыя зладзейскія курсы.

У камэры, дзе нас пасадзілі. чакалі на нас каля 25 зладзеяў-прафэсыяналаў. Яны ў працягу чатырох дзён тэорэтычна і практычна выкладалі ўсе разнавіднасьці зладзейскага штукарства.

Тут і пачалі мае таварышы наракаць:

— Вось, — кажуць, — польская толеранцыя якая! З Польшчы тысячы людзей да Вільні назвозілі. Для літвіноў і латышоў граніцы паадчынялі, а нас беларусаў невядома дзеля чаго за краты разам з крыміналістамі пасадзілі!

Пачула пэўне гэта „начальства", дый давай нас пацяшаць:

— Нічога, ніча! Пасядзеце яшчэ дзень, другі.. хай толькі каранацыя скончыцца, а тагды мы вас усіх выпусьцім.

— Але-ж мы ні ў чым не вінаватыя! — пратэстуем мы.

— Гм... гм... ухмыляецца „начальства". Вечарам паклікалі мяне на „баданьне".

— Ці вы пра каханяне што-небудзь ведаеце?—пытаецца „тайны".

Даруйце! Жонка... дзеці... тлумачыўся я.

— А пра паненак?..

— Пашкадуйце маіх сівых валасоў...

— Дык можа вы хацелі быць тэрорыстам?

— Але-ж скуль! Я—чалавек стварэньне безабіднае. Я навет камара бяз дай прычыны не заб'ю... А тут гэтакае страшнае слова!..

. . . .

Я спаў на голых нарах. Страшэнна балелі бакі. А ад едушанага паветра ў галаве, тахт, выбівалі нейкія малаткі:

— Тэрорыст!.. тэрорыст!.. тэрорыст!...

— Як шкада, — падумаў я тагды, што ня маю люстэрка,—трэба было-б паглядзець, няўжо і запраўды я выглядаю на тэрорыста?!

Гы-грр!.. Гы-грр!—дзесь далёка за вакном прагучэлі гарматы. Гэта — Прэзыдэнт Рэчыпаспалітае і Маршалак Пілсудскі пакідалі Вільню...

Праз гадзіну я і мае таварышы был ўжо на свабодзе.

Дык цяпер можа ня будзеце мяне пытацца, за што нас арыштаўвалі? бо гэтага ані я, ані вы, а кажуць, навет і само „начальства" добра ня ведае.

Польскія газэты пісалі, што „areszty odbyły się w związku z koronacją"... Можа і так!— скуль-жа я ведаю?!

Толькі вось бяда: я — чалавек бедны і календара ня маю, дык і ня ведаю, колькі разоў у год „коронацыя" бывае, а дзеля таго ня ведаю, колькі разоў яшчэ ў гэтым годзе мне прыдзецца сядзець.

Чытаў я нядаўна ў газэтах, што 24 гэтага ліпня нейкі юбілей біскупа Бандурскага ў Вільні будзе. Дык вось цяпер я і ня ведаю: ці „w związku" з гэтым юбілеем нас беларусаў арыштоўваць будуць ізноў, ці не?

Калі-б добра ведаў, што будуць, дык-бы загадзя сабраўся і сам самахоць да арышту на дні тры-чатыры пайшоў-б.

Я. Маланка.

сваіх грам. Л. Абрамовіча, Я. Пілсудскага і Я. Станкевіча, каб разгледзілі рэфэраты дастаўленыя грам. Сьвяневічам II аддзелу генэральнага штабу ў Варшаве.

Пазнёміўшыся з зьместам гэных рэфэратаў і з прыгаворам Маршалкоўскага Суда з 2-га сакавіка 1927 году ў справе пасла С. Воевудзкага, Грамадзкі Суд сцьвярджае:

1) што, як гэта высьнілі агенты II аддзелу генаральнага штабу, установы дэфэнзывы гэнага аддзелу былі скасаваны з мамэнтам пераходу арміі да мірнага стану і што гэтакім чынам у 1923 годзе не існавалі;

2) што аднак, грам. Сьвяневіч у 1921 і 1922 гадох працаваў у II аддзеле галоўнага каманлаваньня войск Сярэдняе Літвы і ў Часовай Урадуючай Камісіі Сярэдняе Літвы, як рэфэрэнт прэсавы і па нацыянальным справам, аб чым беларускаму грамадзянству было ведама;

3) што грам. Сьвяневіч у 1923 годзе і пазьней быў сталым супрацоўнікам віленскіх часопісяў, гдзе зьмяшчаў стацьці, знаёмячы польскае грамадзянства з палітычным беларускім рухам, аб чым беларускае грамадзянства таксама добра ведала;

4) што нібы-то выкрываньне псэўданімаў беларускіх дзеячоў у рэфэратах, пісаных грам. Сьвяневічам для II аддзелу ген. штабу, судзячы паводле зьместу гэных рэфэратаў, магло датыкаць толькі двух псэўданімаў: „А. Навіны“ і „Суліімы“. Аднак-жа той факт, што ведамы беларускі дзеяч Антон Луцкевіч карыстаецца псэўданімам „А. Навіна“, быў падаты да агульнага ведама ў выданай яшчэ да вайны расейскай энцыкляпэдыі Граната, дый пасьля вайны ў вучэбніку гісторыі беларускае літэратуры М. Гарэцкага ў 1920 годзе. Што ж датыча нібы-то расканьспіразаньня другога псэўданіму—„Суліма“, дык гэты псэўданім таксама не прадстаўляе асабліва беражонае тайны і быў падаваны побач з прозьвішчам ягонага ўласьніка на страніцах віленскіх часопісяў, паміж іншым у „Przegl. Wil.“;

5) што няма падставаў западозрыць грам. Сьвяневіча ў здрадзе тайных матываў, якімі беларускі пасольскі клюб кіраваўся ў сваей тактыцы ў школьнай справе, бо напісаны ім у гэтай справе рэфэрат не зьмяшчае ніякіх тайных падробнасьцяў, а выключна пагляд аўтара, што некаторыя дамаганьні беларускіх паслоў прадстаўляюць мінімум іх трэбаваньняў, ад якіх ні ў якім выпадку не адступяцца, некаторыя-ж належаць да максымальнае праграмы;

6) што колькірадковая заметка аб беларускім сакольскім руху ў Празе Чэскай у адным з рэфэратаў грам. Ст. Сьвяневіча прадстаўляе скарочаньне стацьці аб беларускім Сокале, зьмешчанае ў № 2—3 месячніка „Беларускі Студэнт“ з 1923 году, выдаванага ў Празе і ў свой час прадаванага ў Вільні. Такія-ж балей-меней вывады і інфармацыі былі паўтораны Вацлавам Лаўскім у № 1 часопісі „Студэнцкая Думка“, якая вышла ў Вільні ў студзені 1924 году;

7) што аплата, якую атрымліваў грам. Ст. Сьвяневіч за дастаўляныя рэфэраты, ня мела іншага характару, як ганарар, плочаны рэдакцыямі газэт;

8) што, ўрэшце, зьмест рэфэратаў, дастаўляных II аддзелу ген. штабу, па свайму характару адпававядаў публіцыстычным стацьцям і выяўляў імкненьне да прымірэньня з беларускім рухам.

Прыняўшы вышэйшае пад увагу і не знаходзячы ў рэфэратах, пісаных грамадз. Ст. Сьвяневічам, нічога, што мела-бы характар даносу і магло-бы скампрамітаваць паасобных беларускіх дзеячоў, Суд сцьвярджае:

1) што грам. Станіслаў Сьвяневіч ня быў агентам дэфэнзывы ў 1923—1924 гадох, бо ў тым часе гэная ўстанова ўжо не існавала;

2) што дзеяльнасьць грам. Станіслава Сьвяневіча, як аўтара рэфэратаў, дастаўляных праз пасла Воевудзкага II аддзелу генаральнага штабу, ня мела мэтай шкодзіць беларускаму руху і не зьмяшчала ніякіх адзнакаў тайнага выведываньня.

(Подпісы)

Зьмяшчаючы прыгавор бесстароннага Грамадзкага Суда ў справе грам. Сьвяневіча, мы ня можам не адзначыць і таго, якую вагу мае ён для справы пасла Воевудзкага, даючы зусім новае асьвятленьне ягонае дзеяльнасьці.

ХРОНІКА.

Правамочны сход Бел. Нац. Камітэту. У чацьвер, 14-га ліпня, у памяшчэньні Беларускага Нацыянальнага Камітэту (Віленская 12) у 5 гадз. увечары адбыўся сход сяброў Беларускага Нацыянальнага Камітэту пад старшынствам грам. Савіцкага. Сход перадусім заняўся справай машэнства, учыненага сябрамі К-ту, грам. Ярэмічам і Стэповічам, якія ад імя прэзыдыуму — бяз ведама й згоды апошняга — склікалі нейкае сабраньне неналежачых да Камітэту асоб, якое было аб'яўлена сходам Нац. К-ту. На гэным сходзе няведамых Камітэту асоб быў навет выбраны фальшывы прэзыдыум К-ту, аб чым арганізатары сходу паведамілі Камісарыят Ураду на м. Вільню, як аб нібы-то законна адбытых перавыбарах прэзыдыуму.

Сцьвярдзіўшы, што сход гэны зьяўляецца абсалютна незаконным і неправамочным вырашаць справы законна дзеючага Бел. Нац. К-ту, а тым балей выступаць пад назовам законнага Бел. Нац. К-ту, агульны сход Камітэту пастанавіў: бачучы ў створанай 2-га ліпня арганізацыі зусім новую, нічым ня зьвязаную з Камітэтам установу, — прызнаць факт уваходу ў яе дзьвюх палітычных групаў: хадэкаў і групы сельсаюзьнікаў Ярэміча й Рагулі — за акт адыходу гэных груп ад Бел. Нац. К-ту, у якім яны дагэтуль былі прадстаўлены. Што-ж датычыць асобаў Ярэміча і Стэповіча, якія ўчынілі крымінальны праступак, падпісаўшыся незаконна за прэзыдыум Камітэту, — дык іх сход пастанавіў выключыць назаўсёды з складу Камітэту, скіраваўшы адначасна справу іх злачынства ў суд. Аб незаконнасьці скліканага Ярэмічам і Стэповічам сходу 2-га ліпня пастаноўлена паведаміць таго-ж Камісара Ураду.

Выслухаўшы далей заяву Тымчасовага К-ту Бел. Сял. Саюзу, які ўзяў на сябе кіраўніцтва Саюзам, выключыўшы з партыі дасюляшніх яе павадыроў — паслоў Рагулю і Ярэміча, ды грам. Більдзюкевіча, — сход пастанавіў прыняць у склад Бел. Нац. К-ту дэлегаваных Саюзам новых прадстаўнікоў ў асобах грам. Я. Станкевіча, Я. Бэкіша і М. Шавялянкі.

Урэшце, замест заарыштаванага сэкрэтара К-ту грам. Шнаркевіча сход выбраў за сэкрэтара грам. Дварчаніна.

Хто прымаў учасьце ў сходзе ашуканскага Нац. К-ту? Згодна з апублікаваным у „Сял. Ніве“ сьпіскам „арганізацыяў“ і „грамадзкіх устаноў“, якія прынялі ўчасьце ў агідным машэнстве, фабрыкуючы нейкі новы „Бел. Нац. К-тэт“—пры існаваньні законна ўтворанага старога,—аказалася, што ўсё было зроблена выключна хадэкамі кс. Станкевіча і ярэмічавымі сельсаюзьнікамі. Гэтак на ашуканскі сход прыслалі дэлегатаў: партыя „хрысьціянскіх дэмакратаў“, сельсаюзьнікі Ярэміча й Рагулі, польска-беларуская арганізацыя пад назовам „Інстытут Беларускае Гаспадаркі і Культуры“, апанаваная тымі-ж хадэкамі й сельсаюзьнікамі („Сял. Ніва“ толькі сфальшала назоў апошняга, назваўшы яго „Беларускім“ Інстытутам Гасп. і Культуры!), адзін ксёндз хадэк, які выступаў адначасна і ад імя „беларускага каталіцкага духавенства“, з якога перадусім складаецца „хадэцыя“; прадстаўнікі (ці хутчэй—служачыя) двух гандлёвых прапрыемстваў таго-ж кс. Станкевіча і Ярэміча: кнігарні „Пагоня“ і друкарні ім. Скарыны; урэшце—тыя-ж хадэцка-сельсаюзьніцкія паслы, але ўжо пад новай „фірмай“ — як „Беларускі Пасольскі Клюб“, да якога належыць праз нейкае недаразуменьне й сэнатар Багдановіч, чынны сябра „Русскаго Общества“ ў Вільні, ды адначасна—„старшыня“ ашуканскага „Нацкому“...

Якое-ж гэта агіднае надужываньне імя „грамадзкіх установаў“! І як гэта ні дзіўна, але ўсей афэрай кіравалі прадстаўнікі каталікае і праваслаўнае царкоўнасьці!

Ну і „чорныя-ж“ гэта „жучкі“!

Дапамога каапэрацыі. Дзеля таго, каб дапамагчы нашай вёсцы ў тварэньні каапэратываў рознага тыпу,—Галоўная Управа Таварыства Беларускае Школы ўтварыла ў сваім памяшчэньні пры вул. сьв. Ганны 2 ў Вільні спэцыяльны каапэратыўны стол. Усей працай Т-ва ў гэтым напрамку будзе кіраваць ведамы беларускі каапэратар грам. Кузьма Крук, які толькі-што выбраны радным места Вільні.

Водгалас апошніх арыштаў у Вільні. Як мы ўжо падавалі, спасярод заарыштаваных падчас бытнасьці ў Вільні Прэзыдэнта Рэспублікі беларускіх культурных дзеячоў, грам. Лявона Мэнке пабіў у арэштным доме адзін з паліцыянтаў. Цяпер мы даведываемся, што гэты паліцыянт ужо звольнены са службы, ды яшчэ будзе адказваць перад судом.

Лічба безработных. Лічба безработных у Вільні ўсьцяж вагаецца паміж 4 і 5 тысячамі. Гэтак, паводле падлічэньняў у пачатку гэтага тыдня, зарэгістраваных безработных у Вільні лічыцца 4,355.

Афіцыяльны курс грошы на 15 ліпня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

15./VII. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

Грозны цэнзар.

(Азіраўцы, Браслаўшчына).

5-га ліпня Азіраўскі гурток Т-ва Бел. Школы падаў Браслаўскаму павятоваму старасьце просьбу аб дазволе на спэктакль-вечарыну, на якой мелася быць пастаўлена агро-п'еса „Суд над Трохпалёўкай“, у якой, замест цяперашняе трохпольнае гаспадаркі, праводзіцца думка праходу на шматпольную, з засевам культурных траваў, гаспадарку; а замест сьвянцонай вады, ад якое нешта не папраўляюцца нашы ўраджаі, ужываць штучныя гнаі, закладаць малачарні, машынныя таварыствы і заводзіць іншыя палепшаньні. Ня гледзячы на тыя вялікія мэты і на тую павучаючую ролю, якую дае гэтая простая п'еска нашаму гаротнаму селяніну, пан стараста адмовіўся даць дазвол, тлумачачы гэта антыпаньствовым зьместам п'есы. Вельмі дзіўна, што пан стараста направу сельскае гаспадаркі беларускіх сялян у межах Польшчы, якая прынясла-б толькі карысьць Польскай дзяржаве, лічыць крамолою, антыпанствоваю працаю. Цікава толькі адзначыць, што Камісар Ураду ў Вільні і старасты іншых паветаў прагледзілі гэтую „антыпаньствовасьць“ і першы дазволіў друкаваць п'есу, а апошнія — ставіць.

Пётра Браславіч.

Перасьцярога.

(В. Азіраўцы, Брацлаўшчына).

Ад вясны с. г., пашыўшыся ў сабачую скуру, пачалі швэндацца па вёсках у нашым павеце Болюсь Сарбінтовіч з засьценку Прудзінкі і нейкі Алёхна з вёскі Мядзюкоў і намаўляюць сялян, выдаючы сябе за „камуністаў“, каб закладалі „ячэйкі“. З гэтымі мэтамі 14-га чэрвеня зьявіліся ў в. Азіраўцах, маючы пры сабе шмат нелегальнай літэратуры. Але, ніхто з Азіраўскіх літэратуры гэтае ад іх ня ўзяў, залажыць ячэйку адмовіліся, а навет зрабілі заяву да ўладаў аб гэтых „агітатарах“. (Цікава, чаму іх дасюль не арыштавалі)? Але ў некатарых мяйсцох, як напрыклад у Відзах, Друі Брасл. павету, сваю юдашаву працу ім удалося зрабіць, бо ўцягнуўшы гэткім чынам, шмат грамадзян адправілі на Лукішкі. Апошні час маняцца дзеля гэтага самага пайсьці ў вёску Чэрнева Апэйскай гміны.

Пэўне-ж, уладам вядомы гэты спосаб правакацыі беларускіх сялян. І ці ня ёсьць гэта мэтай з прычыны надыходзячых выбараў у Сойм, гэтым агідным, правакацыйным спосабам „пазбыцца“ сьвядомых элемэнтаў вёскі?

Дык перасьцярагаем перад вышпамянёнымі тыпамі грам. Браслаўскага і суседніх паветаў! Ганеце іх са сваіх вёсак, вечарынак, каб ня было мейсца гэтым Юдам сярод нас!

Пётра Браславіч.

Праца ня спыняецца.

(Чамяры, Чамерскай гм., Слонімскага пав.).

Ня гледзячы на тое, што ў нядзелю 26.VI 27 г. у в. Чамярох была згуляна п'еса Янкі Купалы „Паўлінка“ разам з „Заручынамі Паўлінкі“, нашы артысты пастараліся да касьбы, пакуль яшчэ гумна парожныя, падрыхтаваць п'есу „Мікітаў лапаць“ Кудзелько, і з дазволу старасты ў нядзелю 3.VII-27 году згулялі яе. Уваход быў па білетам, цана якіх ад 20 да 50 гр. Народу было каля 300 чалавек—шмат болей, як на першай вечарыне. Увесь даход пайшоў на справы культурна-прасьветныя. Артысты згулялі свае ролі вельмі добра, ня гледзячы на тое, што на падгатоўку было зусім мала часу.

Народ вельмі захапіўся Чамяроўскім тэатрам, але, нажаль, прыходзіць час сенакосу і гумна ўсе запоўняцца сенам, збожам, так што ня будзе мейсца для спэктаклю. І вось, дзякуючы гэтаму, цяпер у ўсіх зьявілася думка будаваць народны дом, дзе б маглі, бяз ніякіх перашкодаў, наладжваць спэктаклі і т. п. Хай-жа гэта думка не пакіне іх аж да зьдзейсьненьня! Асаблівую ўвагу на гэта павінна зьвярнуць моладзь. Трэба зазначыць, што ў нашай вёсцы два хлапцы (не хачу вымяняць іх тут) да спэктаклю аднесьліся вельмі няпрыхільна, кажучы: „Добра, яны зьбіраюць грошы ды толькі купляюць кніжкі ў бібліатэку“!

Эх, як сумна чуць ад сталых хлопцаў такія словы, якія, як нажом рэжуць па сэрцы! Што-ж бы вы, браткі, зрабілі за гэтыя грошы? Мусіць, купілі-б гарэлкі, напіліся-б, самы дый другіх напаілі-б і пашлі-б па вёсцы крычаць, што ёсьць сілы, або вокны біць?

Не, выбачайце! Ужо прайшлі тыя часы, калі вёска залівалася гарэлкай, калі вёска цёмная, як асеньняя ноч, калі моладзь ні аб чым ня думала, апрача гарэлкі — прайшлі. Ужо цёмная ноч праясьняецца над вёскаю; бярэцца за кніжку і селянін-беларус, бо досіць ужо ён нацярпеўся!

Я. М.

Спэктакль-вечарына.

У суботу 2-га ліпня с. г. у салі б. Банку, стараньнямі вучняў Клецкай Беларускай Гімназіі была наладжана вечарына. Ставілі „Сурдут і сярмяга“, драм. абраз у 3-х актах Ул. Гутоўскага.

Добра выканалі свае ролі артысты-вучні: у ролі Мацея — Андрэй Кендыш, у ролі Янкі — Васіль Кендыш, у ролі Пранцішка—Ждановіч, у ролі Алесі—Абрамовічанка і др.

Пасьля адыграньня п'есы, хор сьпяяў некалькі беларускіх песьняў, захапліваючых сваёю мелёдычнасьцю.

Закончылася вечарына танцамі пад гукі вайсковага струннага аркестру. Прысутныя на спэктаклі былі вельмі задаволены ігрою артыстаў, і сваю ўдзячнасьць адзначылі громам воплескаў.

На заканчэньне не магу ня ўспомніць аб тым невялічкім дэфэкце, заўважаным мною на вечарыне—гэта тое, што беларускі нацыянальны танец „Лявоніха“ быў дрэнна сыграны вайсковым аркестрам і апрача таго распачаўся ня першым, як заўсёды, а другім ці трэцім. Гэта віна арганізатараў вечарыны, якую бязумоўна яны пры наступнай вечарыне пастараюцца не дапусьціць.

Міхась Сталёвы.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

На аснове § 21 дэкрэту аб друках з дня 7 лютага (Dz. Pr. Nr. 14 poz. 186 ekz. 1919) прашу Вас, Пане Рэдактар, зьмясьціць у адным з бліжэйшых нумароў Вашай паважанай газэты „Наша Праўда“ наступнае запярэчаньне:

Зьмешчаная ў № 21 газэты „Наша Праўда“ карэспандэнцыя „Міласьцівы айцец“ і падпісаная псэўданімам „Тойсамы“ вельмі далёкая ад сапраўднасьці. Я зусім добраахвотна і бяз націску са стараны дараваў той жанчыне, якой конь зрабіў мне патраву, пры гэтым нікога ня лаяў і ня кідаўся благімі словамі. Што ж датычыць падкінутага служачаму ў мяне Хвядосу дзіцяці, дык маці гэтага дзіцяці была пацягнена да крымінальнай адказнасьці і атрымала заслужаную кару.

Ня ведаю, чым кіраваўся аўтар успомненай карэспандэнцыі, кідаючы незаслужаную цень на маю чэсьць і на маё добрае імя. — скажу толькі, што ня імкненьне да праўды, а жаданьне, магчыма, зьвясьці са мной свае асабістыя парахункі змусіла яго ўхапіцца за такую карэспандэнцыю.

З поўнай пашанай да Вас
сьвяшчэньнік Макар Хвядос.

30/VI—1927 г.
м. Хаценьчыцы, Вялейскага пав.

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАУШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДАМ.

Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. [illegible]іна, Вільня, Нямецкая 22.